ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЭЛУЧАЙЦЕСЯ!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА ў БЕЛАРУСІ

№ 33
ЛІСТАПАД

Ударніца па апрацоўцы канапель т. Шашалевіч. Калгас імя 13-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, Талочынскага раёну.

Чытайце і распаўсюджвайце сваю часопісь

Таварышы калгасьніцы! Часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі“ ажыцц цяўляе задачу мабілізацыі шырокіх мас работніц, калгасьніц, бяднячак і сераднячак — аднаасобніц на выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Часопісь праз свае старонкі перадае лепшыя паказальнікі працы паасобных ударніц брыгад калгасаў, цэхаў, фабрык і саўгасаў, робіць іх здабыткам усіх працоўных. Часопісь дапамагае працоўнай жанчыне разабрацца ў радзе пытаньняў, якія яе цікавяць.

Таварышы дэлегаткі! Распаўсюджвайце сваю часопісь, разгарнеце сацспаборніцтв паміж калгасамі на лепшае распаўсюджаньне часопісі. Пішэце ў часопісь аб сваёй працы Трымайце цесную сувязь з часопісьсю.

РЭДАКЦЫЯ.

РАПАРТ

Арганізатару працоўных жанчын—рэдакцыі часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“.

Калгас „Рэвалюцыя“, Быхаўскага раёну, здаў дзяржаве 240,16 цэнтнэраў жыта замест плянавых 102 цэнтнэраў, аўса—244 пуды, плянам было вызначана 312 пудоў. Бульбы здана 30 тон і 14 тон забуртавана для Ленінградзкага ваенведу, плянавае заданьне было—43,4 тоны. Ільнасемя здана 3,13 цэнтнэра замест 3 цэнтнэра паводле пляну. Гародніны здана: капусты 7.339 кілё, гуркоў—588 кілё, памідораў—3.500 кілё, морквы—6.461 кілё, буракоў сталовых—5.424 кілё, хоць плянавага заданьня па гародніне калгас ня меў. Па ўласнай ініцыятыве бяз плянавага заданьня здана 16 кароў.

Па мабілізацыі сродкаў: па пазыцы „3-ці рашаючы год“ было заданьне—1.700 рублёў, падпісаліся на 2.100 рублёў, заплочана 1.338 рублёў. На акцыі Трактарацэнтру заданьне 1.700 рублёў, заплочана — 2.000 рублёў. Па мэтавых узносах заданьне 80 рублёў, заплочана 200; страхоўка выканана цалкам.

Калгасьнікі калгасу „Рэвалюцыя“ сваю запазычанасьць дзяржаве ў 13 цэнтнэраў ячменю, 67,5 пудоў аўса і ільнавалакна абавязваюцца пабальшавіцку без апартуністычных развазаньняў выканаць да 1-га сьнежня.

Старшыня калгасу „Рэвалюцыя“

АЛЕСЯ КІЛЕСА

Мы маем 6 мільёнаў беспрацоўных

(Напісана дэлегаткай Германіі)

У часе майго кароткага прабываньня ў Савецкім Саюзе я павінна прызнаць, што тое, што ў нас, у Германіі, пішуць буржуазныя газэты аб Савецкім Саюзе, усё хлусьня. Напрыклад, кожны дзень яны пішуць аб голадзе ў Савецкім Саюзе і што дзеці бегаюць голыя. Я была ў дзіцячых садох пры фабрыках. Там усё ўтрымліваецца ў чыстаце, дзеці ходзяць абутыя і апранутыя і іх добра кормяць.

У Германіі жанчыны, якія працуюць, ня маюць магчымасьці аддаваць сваіх дзяцей у дзіцячы сад. Фабрыкі ня маюць дзіцячых садоў і, калі жанчына аддае сваё дзіця ў прыватны сад, то яна павінна плаціць шмат грошай.

У капіталістычнай Германіі жанчыны-работніцы атрымліваюць нізкую зарплату—прыблізна 25 марак, дзяўчаты 14—18 год атрымліваюць каля 16-ці марак. Работніцы за роўную работу з рабочымі атрымліваюць у два і нават тры разы ніжэй у той час, як у краіне Саветаў жанчына за роўную працу атрымлівае роўную і зарплату.

Мы маем 6 мільёнаў беспрацоўных, і колькасьць іх з кожным днём павялічваецца. Зараз пануе страшэнная галеча і нэндза, а з набліжэньнем зімы становішча яшчэ больш пагоршваецца.

Тых, якія выступаюць супроць капіталістаў, выкідаюць з фабрык і заводаў.

Замужніх жанчын звальняюць з фабрыкі. І к муж працуе 3 дні ў тыдзень, дык яна задаволе Так, цэлая сям'я мае толькі 20 марак у тыдзе З гэтай сумы яна павінна плаціць за памяшкань за сьвятло і апяпленьне. А там, дзе ўся сям беспрацоўная, кармілец сям'і атрымлівае 14 мар На гэтыя грошы яна павінна жыць. Арганізав для беспрацоўных сталовыя, але харчавацца т немагчыма, бо замест супу даюць ваду і за г трэба плаціць 10 пфэнігаў. Многія канчак жыцьцё самагубствам. Кожны дзень газэты па дамляюць аб самагубствах цэлых сем'яў.

У Германіі кожная жанчына, якая робіць абор караецца арыштам. Гэта прыводзіць да таго, ш жанчыны самі робяць сабе аборты іголкамі алоўкамі, у выніку яны калечацца на ўсё жыцьц Да доктара і акушэркі яны ня могуць пайсь бо грошай яны ня маюць. Буржуазныя дамы м гуць сабе ўсё дазволіць таму, што яны маю грошы.

Шырокія масы рабочых пачынаюць разумец што толькі шчыльней гуртуючыся вакол камун стычнай партыі і пад яе кіраўніцтвам, рабоч кляса Германіі даб'ецца перамогі над сваім кл савым ворагам.

Анна-Марыя.

Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Г. П. Б-ка Сл. Ак.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

№ 33 ЛІСТАПАД 1931

Прысьвячаецца першаму ўсебеларускаму зьезду калгасьніц

ЗАДАЧЫ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ КАЛГАСЬНІЦ

Усебеларускі зьезд калгасьніц, які склікаецца Калгасцэнтрам на 25 лістапада, будзе першым зьездам калгасьніц за ўвесь час масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў БССР. Тым большае гаспадарчае і палітычнае значэньне набывае для нас гэты зьезд.

Сярод вялікай арміі калгасьнікаў, якія ўліліся ў нашы калгасы за апошнія два гады, ёсьць сотні тысяч жанчын-калгасьніц, якія адыгрываюць вялікую, а часта і рашаючую ролю ў нашым калгасным будаўніцтве.

Калгасьнікі зьяўляюцца галоўнай апорай партыі і савецкай улады на вёсцы. Сярод калгасьнікаў палова, калі ня больш—калгасьніцы. Адсюль і ўся палітычная важнасьць усебеларускага зьезду калгасьніц.

Зьезд павінен паставіць перад сабой задачу яшчэ большага згуртаваньня ўсёй масы калгасьніц вакол галоўных задач, якія на даным этапе набываюць найвялікшае значэньне ў нашым калгасным будаўніцтве. Тут у першую чаргу высоўваецца перад намі важнейшая задача сёнешняга дня — **арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.** Пытаньнямізьдзельшчыны і правільнага ўліку працы ў працаднёх павінна быць зацікаўлена кожная калгасьніца, бо мы ведаем нямала такіх фактаў апартуністычнага сорту ў калгасах, калі працу калгасьніцы прабавалі і прабуюць недаацаніць. Між тым практыка работы ў калгасах, асабліва за апошні год, паказала, што калгасьніцы часта актыўней да сьвіней і асабліва да парасят нябывалую кла патлівасьць. Мы такіх адданых калгасьніц маем і ў жывёлагадоўчых калгасах, і ў ільнаводчых, і ў іншых. Іх вопыт трэба перадаць усім калгась ніцам.

Работу лепшых перадавых калгасьніц трэба належным чынам і ацаніць. Гэтага дабіцца можна толькі пры правільным укараненьні зьдзельшчыны ў калгасах на аснове дасканалага ўліку працы калгасьніц, як і ўсіх калгасьнікаў, вылічанай у працаднёх.

Вакол пытаньняў зьдзельшчыны і ўліку працы калгасьнікаў і калгасьніц, і ліквідацыі абязьлічкі ў працы мы павінны праз зьезд калгасьніц мабілізаваць усю масу калгасьніц.

Разьмеркаваньне ўраджаю і калгасных даходаў праходзяць у раёнах вельмі марудна. Ня гледзячы на ўсе дырэктывы, яшчэ ва многіх калгасах пануе кулацкая ўраўнілаўка, дзяльба ўраджаю па едакох, душах, толькі не па працаднёх, не па якасьці працы. Кулацкі ўплыў тут зусім відавочны. „Усе ў калгасах аднолькавыя—кажа кулак,—трэба дзяліць пароўні". Падкулачнікі, лодыры, гультаі за раз-жа падхапляюць гэты кулацкі лёзунг і пачынаецца дзяльба па душах. Хто-ж ад такой кулацкай дзяльбы церпіць страту? Зразумела, што лепшыя калгасьніцы, якія добрасумленна і па-ўдарнаму працавалі, а ў выніку атрымліваюць столькі, колькі і той, які лодыра корчыў. Уся асноўная маса калгасьніц застаецца нездаволенай, а кулаку гэта і патрэбна, каб разбурыць калгас.

На пытаньнях разьмеркаваньня ўраджаю і калгасных даходаў трэба сканцэнтраваць увагу зьезду калгасьніц з тым, каб праз зьезд дабіцца правільнага правядзеньня гэтага разьмеркаваньня ва ўсіх нашых калгасах.

У справе ажыцьцяўленьня адказьнейшых з а д а ч, якія высунуты перад намі партыяй і ўрадам у галіне разьвіцьця сацыя-

лістычнай жывёлагадоўлі, калгасьніца павінна адыгрываць вялікую ролю. Задачы камплектаваньня стада малочных, сьвінагадоўчых і птушніцкіх таварных фэрмаў; задачы догляду каровы, сьвіньні, птушкі; задача павялічэньня таварнасьці калгаснай гаспадаркі—важнейшыя задачы, на вырашэньне якіх павінны быць мабілізаваны ўсе калгасьніцы. Змаганьне са спажывецкімі і рвацкімі тэндэнцыямі ў калгасах—гэта таксама важнейшы момант у агульнай нашай барацьбе за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Па ўсіх гэтых пытаньнях зьезд павінен сказаць сваё моцнае слова.

Важнейшым фронтам барацьбы за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў нашай рэспубліцы зьяўляецца фронт тэхкультур. У справе ўборкі, цярабленьня, мочкі, сушкі ільну наша калгасьніца бязумоўна займае першае месца. Справа першапачатковай апрацоўкі ільну і своечасовай і поўнай здачы (продажы) яго дзяржаве залежыць галоўным чынам ад калгасьніц, ад іх актыўнасьці і ўдарнай працы. Калі мы сёлета з посьпехам убралі ў нашых калгасах 107 тысяч га ільну і 12000 тысяч *га* канапель, дык у гэтым вельмі вялікую ролю адыгралі калгасьніцы. Такую-ж ролю яны павінны адыграць і ў справе пераапрацоўкі гэтага ільну і канапель і своечасовай здачы (продажы) іх дзяржаве, каб пусьціць іх на фабрыкі для вырабу мануфактуры, вяровак і інш. неабходных рэчаў. Зьезд павінен будзе сканцэнтраваць увагу і энэргію ўсіх калгасьніц на задачах посьпяховай барацьбы за тэхкультуры ў нашых калгасах.

Вось важнейшыя пытаньні, практычным вырашэньнем якіх зойме цца зьезд калгасьніц.

Мы ўпэўнены, што зьезд знойдзе тыя шляхі і сродкі, з дапамогай якіх мы ўцягнем усю масу калгасьніц у жывую і актыўную работу па ажыцьцяўленьні дырэктыў партыі і ўраду ў галіне нашага калгаснага будаўніцтва.

М. Калмык.

За высокую якасьць працы, за індывідуальны ўлік

ЗЬНІШЧЫМ УНУТРЫБРЫГАДНУЮ ЎРАЎНІЛАЎКУ

У калгасе „Чырвоны май" (Ваташыцкага сельсавету, Дубровенскага раёну) у справе арганізацыі жаночай працы ёсьць значныя недахопы. Хаця жанчыны ў пэрыяд уборкі бульбы былі арганізаваны ў спэцыяльныя жаночыя брыгады, але ў працы гэтых брыгад ня была забясьпечана зьдзельшчына, і ўлік працы жанчын рабіўся не індывідуальна і не групавым мэтадам. Існавала так званая ўнутрыбрыгаднаяўраўнілаўка. Што-ж атрымалася ў выніку такой ураўнілаўкі?

Паводле нараду выбраць 8 гэктараў бульбы была вызначана брыгада ў складзе 39 жанчын (ня лічачы канавода, буртаўшчыка і возчыка). Норма выпрацоўкі была ўстаноўлена ў 500 квадратовых мэтраў у дзень на кожную жанчыну. Работа лічылася, як цяжкая, з расцэнкай у 1¼ працадня. Уборка бульбы праводзілася з 14 па 18-га кастрычніка. Фактычна з агульнага складу брыгады, у якую ўваходзіць 39 жанчын, на працу выходзіла ад 19 да 23 чалавек. У выніку ўраўнілаўкі (кожнай жанчыне залічвалася аднолькавая колькасьць працадзён незалежна ад колькасьці і якасьці праробленай працы) калгасьніцы выпрацоўвалі каля 44 проц. нормы кожная.



т. Юрэвіч—лепшая ўдарніца калгасу „Чырвоная Ніва" Слуцкага раёну.

Гэтая жаночая брыгада выканала плянавае заданьне па ўборцы бульбы толькі на 23,6 проц. Так працавала брыгада жанчын пад кіраўніцтвам брыгадзіра тав. Іўкіна.

Другая жаночая брыгада ў гэтым-жа калгасе, пад кіраўніцтвам брыгадзіра тав. Волкава, працавала па ўборцы ільну. Гэта брыгада ў складзе 27 жанчын атрымала наряд на 17 *га* ільну з разьлікам па 15 жанчын на 1 *га*, з тэрмінам выкананьня заданьня ў 9 дзён.

Выхад на работу гэтай брыгады на працягу 10 дзён у сярэднім складаў 54,8 пр. Выканана работа была толькі на 51,1 проц.

Толькі асобныя калгасьніцы гэтай брыгады паказалі высокія нормы выпрацоўкі: **Шандунава Праскоўя — вырывала 785 кв. мэтраў у дзень**, таксама і **Шандунава Вольга. Яны ўсе дні, не прапускаючы, выходзілі на работу.**

Пры наяўнасьці ў калгасе „Чырвоны май" 110 калгасьнікаў, у выніку дрэннай расстаноўкі сіл, унутрыбрыгаднай ураўнілаўкі, значнага нявыхаду на работу і наогул нявысокай працоўнай дысцыпліны, быў недахват працоўнай сілы ў 5.080 працадзён.

На ўборцы бульбы зусім не выкарыстоўваліся калгасьнікі, якія знаходзіліся на іншых работах (70 чалавек). Між тым, калі-б была скарыстана толькі палова іх, дык недахват працоўнай сілы быў-бы зьменшан да 1.566 працадзён і ўборку бульбы можна было-б скончыць да 10-га кастрычніка. Фактычна-ж у калгасе нават да 21 кастрычніка ня было ўбрана каля 33 *га* бульбы, ня вырвана 25 *га* ільну і г. д.

Другая справа ў калгасе „Чырвонае жэжліна" (Лепельскага раёну). Там **брыгада па цярабленьні ільну замест устаноўленай нормы на 1 калгасьніцу ў 9 сотых гэктара, за 1 дзень выконвала 12-13 сотых, або на 35,5 проц. больш нормы.** Па капаньні бульбы ў гэтым калгасе асобныя брыгады таксама перавыконвалі норму.

У калгасе „Камінтэрн" уборка ільну праходзіла з яшчэ большымі посьпехамі. Там нормы выпрацоўкі перавыконваліся ад 55 да 58 проц. і 1 гэктар ільну ўбірала 7 і менш калгасьніц.

Гэтыя дасягненьні аказаліся ў выніку разьбіўкі брыгад па ільнацерабленьні і капаньні бульбы на больш дробныя групы і ўвядзеньня ўліку працы кожнай паасобнай калгасьніцы ўнутры груп. Такім чынам—ліквідацыя ўнутрыбрыгаднай ураўнілаўкі дала добрыя выніні.

С. Кудзінаў.

ЗА ПРАВІЛЬНУЮ АРГАНІЗАЦЫЮ ПРАЦЫ Ў КАЛГАСЕ

Арганізацыя працы ў калгасах на аснове ўкараненьня сапраўднай зьдзельшчыны ва ўсіх работах—гэта цэнтральнае зьвяно ў справе вырашэньня задачы партыі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Наша партыя і шырокія масы калгасьнікаў на гэтым шляху ўжо маюць значныя дасягненьні і вопыт, які мы павінны глыбока вывучаць і папулярызаваць.

Аднак прарывы, якія мы мелі і ў гэтым годзе ў радзе калгасаў (па ўборцы ўраджаю, бульбы, зяблева і г. д.), з усёй відавочнасьцю сьведчаць, што ў галіне правільнага скарыстаньня рабочай сілы, інвэнтару, машын, на аснове зьдзельшчыны і замацаваньня працдысцыпліны, у гэтых калгасах справа абстаіць дрэнна.

Вырашэньне задачы замацаваньня новых форм працы ў калгасах павінна стаяць у парадку дня перад кожнай парт'яй-эйкай, калгасам, сельсаветам. Масавая праверка таго сапраўднага стану арганізацыі працы ў калгасах, мабілізацыя калгасьнікаў і калгасьніц на бязьлітаснае змаганьне з праяўленьнямі безадказнасьці, расхлябанасьці, з нядбайнымі адносінамі да ўліку. Барацьба за калектыўную працдысцыпліну, за лепшую якасьць працы і максымальнае скарыстаньне ўсіх рабочых рук і машын у калгасе, за плянавасьць у рабоце—вось вузлавыя пункты для вырашэньня пастаўленай задачы.

У чым канкрэтна праяўляюцца адмоўныя бакі ў нашай працы па ўкараненьні зьдзельшчыны ў сучасны момант?

Па-першае, у **фармальнасьці пераводу ў радзе калгасаў** і ўсіх работ **на зьдзельшчыну.**

Брыгады ствараюцца на вельмі кароткі тэрмін і пастаянная цякучасьць іх складу не дазваляе замацаваць працдысцыпліну ўнутры яе.

„У тых калгасах—піша інструктар Калгасцэнтру тав. Лаўрэнаў з Бялыніцкага раёну,—якія арганізаваліся вясной 1931 года і перад уборачнай кампаніяй зьдзельшчыну як прынцып ведаюць, але ўліку няма, і адзначаюць працадні палачкамі".

У калгасе „Свабода" Чашніцкага раёну ўся жывёла, каровы заганяюцца ў адно цеснае месца і стаяць па калена ў брудзе, бо даглядаюць яе па чарзе.

Па-другое, у радзе калгасаў няправільна ўсьвядомлен прынцып, як павінна ўводзіцца зьдзельшчына, дапушчаюцца лева-апартуністычныя перагібы, якія спрыяюць кулацкай агітацыі і барацьбе супроць калгаснага будаўніцтва. Гэта выяўляецца ў тым, што ўжываюць мэтады „голага" камандаваньня пры адсутнасьці якой-небудзь масава-выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў і калгасьніц, і ў няправільным ўжываньні брыгаднага мэтаду работы. У Койданаўскім раёне ёсьць такія калгасы, дзе былі заведзены кнігі „загадаў". Вось адзін характэрны прыклад з калгасу „Будзённы № 1". Загад: усе жанчыны і мужчыны павінны выйсці на работу ў цэнтр калгасу капаць бручку і буракі. За нявыхад на работу будуць прыцягнуты да адказнасьці як за зрыў і будуць накіраваны ў сельсавет. Старшыня калгасу Тураў".

У калгасе „1-га мая" Койданаўскі раён не растлумачвалі калгасьнікам колькі працадзён ім будзе запісана за выкананую работу. Штрафы ўжываліся ў адносінах да калгасьнікаў (сьпісваньне 13—20 працадзён) і два калгасьнікі былі нават адданы пад суд за нявыхад на работу.



Конюх калгасьніца.

Барацьба з фармальнымі адносінамі да ўвядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах, з фактамі скажэньня яе на справе зараз павінна быць па ўсім фронце разгорнута. Неабходна кожнаму калгасьніку і калгасьніцы даць на руку працоўную кніжку з адзнакай ім зробленай працы. Весьці сыстэматычную барацьбу супроць цякучасьці складу брыгад.

Неабходна практыкаваць прымацаваньне брыгад да асобных культур на ўвесь пэрыяд работы ад пачатку да канца. Заданьне як правіла патрэбна даваць на брыгады ў цэлым, а потым брыгадзір разьмяркоўвае работу па групах, або нават сярод асобных калгасьнікаў і вядзе ўлік выпрацоўкі па групах і асобных калгасьніках. Ні ў якім разе не дапускаць раздрабленьня брыгад.

Надзвычайна важнае значэньне ў справе ўкараненьня зьдзельшчыны мае нармаваньне працы. Зараз кожны калгас павінен перагледзець свае нормы, улічыць свой вопыт і распрацаваць такія нормы, якія-б сапраўды адказвалі задачам усямернага павышэньня прадукцыйнасьці працы.

Мы маем усе магчымасьці для таго, каб на аснове вопыту перадавых калгасаў павысіць вытворчыя заданьні калгасьніка за дзень.

Задачы ў жывёлагадоўлі рашучым чынам павярнуць на такі ўлік працы, пры якім абавязкова-б улічвалася тая прадукцыя, якую дае жывёла.

Шырокім разгортваньнем вытворча-масавай работы, сыстэматычным правядзеньнем вытворчых нарад, праз канфэрэнцыі працаўнікоў паасобных галін гаспадаркі і нават па кваліфікацыях, напрыклад канфэрэнцыі даярак, сьвінарак і г. д., з шырокім вывучэньнем усіх дасягненьняў у галіне арганізацыі працы і шырокай папулярызацыі іх, даб'ёмся сапраўднага замацаваньня калгасаў.

Балцін.

Арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньнем калгасаў узьнімем калгасны рух на новую ступень, ліквідуем кулацтва як клясу

ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА ЗАМАЦОЎВАЕ КАЛГАС

Зьдзельшчына і правільны ўлік працы зьяўляюцца асноўнымі ў працы па арганізацыйным умацаваньні калгасаў.

— Зьдзельшчына мае выразныя вынікі, якія самі за сябе агітуюць,—расказвае калгасьніца Ляхаўскага калгасу. Лепельскага раёну, Надзя Кажарская. Раней, да ўвядзеньня зьдзельшчыны, рабілі абы рабіць. На першым пляне быў свой уласны агарод, свая жывёліна, а калгаснае гэта чыёсьці, зацікаўленасьці ў працы ня было, бо аднолькава атрымлівалі і працавітыя і гультаі Увядзеньне зьдзельшчыны ў корані зьмяніла адносіны да працы. Наяўна ўбачылі, што ніякая праца не прападае марна, зразумелі асноўнае—што заробіш, тое і атрымаеш. **Выхад на работу павялічыўся. Калі з 50 працаздольных жанчын раней выходзіла 10—15 чалавек, дык са зьдзельшчынай выхад павялічыўся да 30—40 жанчын у сярэднім.**

У радзе калгасаў зьдзельшчына ўведзена фармальна — нормы даюць, але ніхто не правярае зробленае, проста запісваюць за дзень адзін працадзень (калгас імя Варашылава, Замоскі сельсавет, калгас „Савецкая Беларусь", Лепельскага раёну, калгас „Перамога", Менскага раёну).

Генэральны сакратар ЦК КП(б)Б у сваёй прамове на апошнім пленуме сказаў, што „найбольш скажонай формай зьдзельшчыны зьяўляецца запіс працадзён без праверкі нормы выкананьня". Фактычна ў такіх выпадках зьдзельшчыны няма, атрымліваецца поўная ўраўнілаўка, супроць якой трэба павесьці самую жорсткую барацьбу. Кожная зробленая праца павінна быць праверана брыгадзірам, занесена ў табэль-нарад і толькі па вестках з табэлю яна пераносіцца ў працоўныя кніжкі, куды, выходзячы з працобленай працы і выкананьня нормы, заносяцца працадні.

„Цяжка вясковую работу перавесьці на зьдзельшчыну"—гаворыць калгасьніца з Ратамскага калгасу, „бо ў дзень прыходзіцца часамі мяняць некалькі работ". Такія матывы прыводзяць і многія іншыя калгасы („Чырвоная горка", Лепельскі раён). У такіх выпадках трэба абавязкова мець нарад на кожную работу, куды заносіцца праца, працобленая брыгадай, і па кожнай асобнай працы запісваюцца зароблены працадні.

У нас яшчэ слаба на сёнешні дзень адчуваецца барацьба самі х калгасьнікаў за правільныя нормы. У калгасе „БАН", Менскі раён, была прынята норма капаньня бульбы—33 чалавекі на *га*. Норма яўна няправільная. Гэта ведалі добра самі калгасьніцы. Праўленьне калгасу цягнулася ў хвасьце нездаровых настрояў пасобных калгасьнікаў, і няправільныя нормы засталіся.

Кожная брыгада ня толькі павінна абгаворваць нормы працы, але выходзячы са сваіх асабліных умоў, высоўваць свае сустрэчныя нормы, выклікаць на спаборніцтва другія брыгады.

Бародзіч Варка з калгасу „Чырвоная горка", Ляхаўскі сельсавет, Лепельскага раёну, расказвае, што калі яе брыгада нормы перавыконвала, дык канцылярыя ня верыла весткам, якія даваліся брыгадзірам, і запісвала па-свойму—толькі за норму. У выніку такіх запісаў брыгада адмовілася перавыконваць нормы. Такі выпадак характарызуе поўнае неразуменьне канцылярскімі працаўнікамі калгасу сэнсу зьдзельшчыны. Ёсьць выпадкі, калі брыгадзіры няправільна вядуць запіс працадзён. У калгасе „Чырвоны спэцыяліст", Менскага раёну брыгадзірша Волька Лапа вельмі няправільна вядзе запіс. Сама лянуецца і на працу ня выходзіць. Равуцкай Юльцы ня ўпісала 18 працадзён, а сабе акуратна запісвае за кожны працоўны дзень $1^1/_4$ працадня.

Трэба весьці барацьбу з няправільнымі запісамі, выносячы гэтае пытаньне на праўленьне калгасаў, агульныя сходы, асьвятляючы матар'ял у друку—раённай газэце, часопісі „Работніца і Калгасьніца Беларусі" і інш.

Калгасьніцы і саўгасьніцы, трэба рашуча змагацца за ўвядзеньне зьдзельшчыны, памятаючы, што гэта асноўны сродак барацьбы за арганізацыйнае ўмацаваньне калгасаў. Пры зьдзельшчыне няма месца лодырам! Давайце рашучы адпор кулаком і іх падпявалам, якія пралазяць у калгасы, выступаючы супроць зьдзельшчыны з мэтай разбурыць калгасы з сярэдзіны.

Высоўвайце брыгадзірамі больш працавітых і лепшых ударніц.

Б.



У калгасе Сярэдняй Волгі. Ссыпка зярна з камбайну.

Зьнішчыць недахопы ў разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі

Калгас „Новы шлях" Чырвона-Слабодзкага *раёну вядзе* змаганьне за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Камплектаваньне стада з 15 кастрычніка па 7-е лістапада гэтага году ўзрасло з 223 галоў да 275 галоў рагатай жывёлы. Зьнішчана поўнасьцю абязьлічка ў абслугоўваньні жывёлы, уся праца пераведзена на зьдзельшчыну.

Дрэнна толькі справа з будаўніцтвам у калгасе. Ня скончан яшчэ дах у аборы і сьвінарніка, цалкам ня крыта канюшня. Як вынік гэтага, скот скучаны ў цесных хлявох і правядзеньне санветмінімуму амаль немагчыма.

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва слаба разогрнута паміж калгасьнікамі.

Брыгада: Понтус Ганна і Гапонава Ганна.

НАРАДА У РЭДАКЦЫІ

Маленькі пакойчык рэдакцыі ледзь зьмяшчае ўдзельніц нарады. Расчырванеўшыся, калгасьніцы ўважліва слухаюць прамову рэдактара часопісі „Работніца калгасьніца і Беларусі", які выразна ставіць задачы перад нарадай.

— Арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў зараз—асноўная задача. Сьмялей вылучаць калгасьніц на кіруючую работу—брыгадзірамі, старэйшымі сьвінарамі і г. д. Даярка, сьвінарка, пастух зараз становяцца цэнтральнай фігурай у жывёлагадоўлі, таму ім трэба аддаваць максымум увагі. Першапачатковая апрацоўка ільну і здача яго дзяржаве—важнейшая задача ільнаводчых калгасаў.

Ня можа выседзець да канца прамовы дэлегатка калгасу імя Сталіна Радзюк Тацьцяна. За самае нутро кранаюць яе словы рэдактара.

— Вось я скажу, як у нас працуюць. У нашым калгасе было ўсяго 13 гаспарак. Кулацкія падпявалы агітавалі супроць нас, казалі, што мы з голаду падохнем, але-ж мы на іх увагі не зварачалі і працавалі. У чэрвені 1931 году быў у калгасе вялікі прыліў. Залезьлі ў калгас і кулацкія падпявалы, якія пачалі развальваць яго з сярэдзіны. Нічога не аграмаджвалі, а нават тое, што было з інвэнтару, яны парасьцягвалі.

У нас у калгасе дрэнна выходзяць на работу, праз гэта работа часта зрываецца. Так падпявалы кожны дзень падрываюць наш калгас. Яны больш увагі аддаюць сваёй гаспадарцы, якой яшчэ не аграмадзілі. Праўленьне калгасу сьпіць і на гэта ўвагі не зварачае.

Ёсьць у нас і ўдарніцы, як **Коцька** Вера, у якой маленькія дзеці і яна ніколі не зрабіла ніводнага прагулу. Але ўдарнікі ў нас не прэміююцца.

Ударніца камуны „Пралетарская Воля" (Паўночны Каўказ). Прэміявана за ўзорны догляд цыплят.

— Мы з вялікай ахвотай уступілі ў камсамол, але на сёньнешнідзень ня ведаем, ці зьяўляемся мы камсамолкамі, на сходы нас ня клічуць і калі яны адбываюцца, не паведамляюць. Сакратар ячэйкі тав. Баркун на гэта не зварачае ўвагі. Калі мы прыедзем у калгас, заўзята будзем **змагацца за ўмацаваньне і ачыстку нашага калгасу ад варожых людзей.**

Калгасьніцы менскага раёну ў рэдакцыі „Раб. і Каласьніца Бел.".

Здаровая, бойкая ўдарніца з калгасу „Чырвоны спэц" **Ваўчок** Анюта расказвае: „Мы ўжо ўсю уборку скончылі. Але вось улік працы ў нас пастаўлен кепска. Брыгадзірка **Лапо Вольга** сьпіць заўсёды і ніколі ня ведае, як працуе і колькі выпрацоўвае яе брыгада. У калгасьніцы **Равуцкай** Юлькі прапала 18 працадзён з-за кепскага ўліку. Улік у калгасе гэта ўсё". **Асьпяровіч** Маня дадае: „70 кароў, якія стаяць у нашым калгасе, даглядаюцца вельмі кепска. Жывёлавод **Савіч** п'янствуе. Сам нап'ецца, а каровы часта бываюць няпоеныміі някормленымі. Праўленьне не рэагуе на такія зьявы. Такіх як Савіч і Лапо мы будзем вырываць як глухую крапіву з калгасу і ісьці далей да яго замацаваньня".

Кучмель Соня з калгасу імя Леніна, Калодзішчанскага сельсавету, з запалам гаворыць: „Наша праўленьне нядбайна адносіцца да апрацоўкі ільну. гэктараў былі поздна пасеяны, а пасьля таго, як мы яго вырвалі, ён зараз бяспрытульным ляжыць у гумне і яго расьцягваюць і топчуць нагамі".

— Гэтыя факты сьведчаць аб тым,—абагульвае думку калгасьніц тав. Шапіра,—што некаторыя праўленьні на мясцох яшчэ не павярнуліся тварам да арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў. Нам зараз неабходна згуртаваць усю увагу ўдарніц, дэлегатак на гэтым важнейшым вучастку работы.

Калгасьніцы абяцалі надалей упарта змагацца за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

К.

Барацьба за хлеб—барацьба за сацыялізм. Мацней удар па кулаку, па рвачох, па дэзарганізатарах збожжазагатовак. Ні аднаго цэнтнэра прыватніку. За выкананьне плянаў загатовак.

ВУЧЫЦЦА У СПАРТАКАЎЦАЎ

Кілёмэтраў 15 на ўсход ад раённага цэнтру Кармы на месцы вузкіх палосак беднякоў і серадняко ў вёскі Быча раскінуўся калгас „Спартак".

Арганізаваўся ён у 1929 годзе. За 3 гады спартакаўцы маюць шмат дасягненьняў. Іх гаспадарка штодзенна расла і ўзмацнялася. Сваей арганізаванасьцю ў рабоце, посьпехамі ва ўборцы, сяўбе, і іншых гаспадарчых працах калгасу спартакаўцы пераканалі сваіх суседзяў—беднякоў і серадняко ў-аднаасобнікаў у тым, што адзіны шлях іх выхаду з галечы і жабрацтва—калгас. Прайшоўшыя 3 гады далі калгасу 125 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак Бачаншчыны. Зараз калгас „Спартак" займае ўжо ня 320 *га*, а 1.700. Дружная сям'я спартакаўцаў складаецца з 185 гаспадарак—642 членаў.

Спачатку калгас ня меў пэўнай спэцыялізацыі, мялі лён і каноплі, разводзілі сьвіней і рагатую жывёлу. Цяпер „Спартаку" вызначан пэўны напрамак гаспадарчага разьвіцьця — сьвінагадоўля.

Да 1-га лістапада гэтага году калгас павінен быў арганізаваць у сябе сьвінагадоўча-таварную фэрму, паставіць у ёй 100 штук дарослых сьвінаматак, на 100 сьвінамесц пабудаваць новы сьвінарнік. Падняцьцем сваёй спэцыялізацыі, наладжаньнем узорнай работы на фэрме заклапочаны зараз спартакаўцы.

— Сьвіньні—гэта-ж галоўнае ў нас, мы іх больш за ўсё і даглядаем,—кажа старшыня калгасу Якавенка. І сапраўды спартакаўцы аддалі ўсю ўвагу фэрме, яны заваявалі пяршынства ў раёне.

Трэба толькі захацець... Ужо на 12 кастрычніка спартакаўцы свой плян камплектаваньня перавыканалі. Яны паставілі на сваёй СТФ 160 сьвінаматак замест 100, маюць 50 падсьвінкаў, 40 парасят і 2 кныры ёркшырскай пароды.

— Як-жа вы камплектавалі—пытаемся ў старшыні калгасу.

— Ды зусім проста—адказаў Якавенка.

— Кажуць, што няма дзе браць сьвіней—глупства. Трэба толькі захацець, дык за 5 дзён можна дастаць і сьвінаматак, і падсьвінкаў, і кныраў—і фэрму ўкамплектуем. Вось, напрыклад, як: амаль у кожнага калгасьніка ёсьць у аднаасобным карыстаньні сьвіньні. Мы з сакратаром партыйнай ячэйкі склікалі агульны сход калгасьнікаў разам з аднаасобнікамі і сталі абмяркоўваць пытаньне аб аграмаджаньні сьвінаматак.

— І што вы думаеце?—80 калгасьнікаў на сходзе згадзіліся аграмадзіць сваіх сьвінаматак. Больш таго, нават 5 аднаасобнікаў здалі свае сьвінаматкі ў калгас, а мы ім у любы момант вернем кабаны такой-жа вагі.

Плюс да гэтага 10 сьвінаматак з парасятамі, што выменялі ў суседняй МТФ на кароў і гэтым ліквідавалі прарыў... Гэта-ж зусім простая рэч — тлумачыў Якавенка.

Калгасьніцы за стрыжкай авец.

Калгасьнікі „Спартака" наладзілі ўзорную работу на фэрме.

Кожнай сьвіньні—жылплошчу. Заданьне па будаўніцтве калгас „Спартак" таксама выканаў поўнасьцю і да тэрміну. Калгас скончыў будаўніцтва новага сьвінарніка на 100 сьвінамесц. Пароблены станкі для кожнай сьвіньні, кармушкі. Сьвінарнік чысты, сьветлы (з вокнамі), ацеплены. Вучні Бычанскай сямігодкі ўзялі шэфства над СТФ—парабілі станкі, пранумаравалі кармушкі.

Надзвычай характэрна, што і сьвінарнік, і абсталяваньне калгас зрабіў зусім без дэфіцытных матар'ялаў. Ударніца-сьвінарка Ражкова Наста кажа:

— Ну, калі нашаму калгасу не дадуць прэміі, дык уж ня ведаю. Гэта-ж паглядзеце: страха накрыта саломаю, станкі і кармушкі пазъбіваны драўлянымі цьвікамі—а ці дрэнна? Я думаю, што ня ўступіць страсе з гонты і кармушкам, што пазьбіваны жалезнымі цьвікамі.

У сьвінарніку паслана добрая, па ўказаньні агранома, падлога. Тут-жа на фэрме пабудавана кухня і памяшканьне для вартаўніка і аднэй даглядчыцы.

Абвяшчаем сябе ўдарніцамі. Прышоўшы на сьвінарнік, можна адразу заўважыць на адным з пабеленых слупікаў, вышэй кармушкі, штодзенную газэту брыгады сьвінарак „Штодзенны буксір". У ёй шырока асьвятляецца праца лепшых сьвінарак-ударніц, праз яе выпраўляюцца адмоўныя бакі ў працы фэрмы.

У першым нумары „Штодзеннага буксіру" сьвінаркі высунулі сацыялістычны дагавор брыгадзе будаўнікоў.

Вось галоўныя пункты дагавору:

— Мы, брыгада сьвінарак калгасу „Спартак" Ражкова Наста, Ражкова Ганна, Ражкова Вася, Біндзюкова Арына, Глушкіна Мар'я, Сталаволенкава Мар'я, Марчанка Саша і Буднік Церах, выклікаючы на сацспаборніцтва брыгаду будаўнікоў, бярэм на сябе наступныя самаабавязацельствы:

— Дабіцца ня менш двух апаросаў у год і каб з кожнага апаросу захаваць ня менш 8 парасят.

— Шляхам сваячасовага і нармаванага догляду дабіцца, каб кожны дзень жывая вага кормнага падсьвінка прыбывала на 0,5 *кг*, а 8-месячны ўзрост каб падняўся да 100 *кг*.

— Штодзенна пасьля кожнага кармленьня вымываць кармушкі, а подсьціл з-пад сьвіней убіраць два разы ў дзень.

— Сваячасова прыходзіць на працу (з 6-ці гадзін раніцы), даваць сьвежы корм.

— Перавесьці ўсю працу фэрмы на зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку.

І далей брыгада зварачаецца да будаўнікоў.—... Будаўнікі, мы вас бярэм на грамадзкі буксір, вы адсталі. Ліквідуйце свой прарыў, прагулы...

Узятыя абавязкі выконваюцца. Зараз на фэрме ўведзена зьдзельшчына. Усе сьвіньні прымацаваны да паасобных сьвінарак, абязьлічка ліквідавана.

— І вось—кажа брыгадзірша, сьвінарка Ражкова Наста—пагляджу, колькі, напрыклад, да Біньдзюковай Арыны прымацавана сьвіней і як яна даглядала іх: ці зьмяняла яна подсьціл, ці мыла кармушкі, прымацаваныя да яе, ці сваячасова прышла на працу, і тады толькі запісваю ёй працадні.

На фэрме прыступілі да абсталяваньня мэханізаванай падачы кармоў, ёсьць спэцыяльны працаўнік па загатоўцы кармоў, тут-жа на дварэ закладзена 40 тон сіласу для сьвіней.

Выконваюцца ўсе санітарныя правілы. Аднак, патрэбна адзначыць, што на фэрме, як і ва ўсім калгасе, не наладжан улік. Працадні заносяцца ў працоўныя кніжкі толькі 2 разы ў месяц.

„Спартак"—кандыдат на конкурс. Калгас „Спартак", які сапраўды ўзорна паставіў работу на фэрме, павінен паслужыць прыкладам для ўсіх. Адстаючыя калгасы павінны вучыцца ў спартакаўцаў, пайсьці па іх шляху. Наладзіць работу на фэрмах так, як наладзіў „Спартак".

„Спартак" павінен быць залічан кандыдатам на Ўсебеларускі конкурс па жывёлагадоўлі. Ударніц-сьвінарак неабходна прэміяваць.

Т. Цалко.

Падарунак Кастрычніцкаму сьвяту—чырвоны абоз ільну

Думка аб арганізацыі чырвонага абозу ільну нарадзілася ў паасобных калгасьніц, калі пачалі прыступаць да апрацоўкі ільну. Пагаворвалі паміж сабою, падлічвалі колькасьць ільнамялак, каб правільна расставіць сілы. Радаваліся ляхавіцкія калгасьніцы нават дванаццацівальцавай ільнамялцы. Загадзя жанчыны падлічылі, што калі пусьціць ільнамялку ў дзьве зьмены, дык 25 пудоў ільнавалакна ў дзень забясьпечана. Абгаворваюць жанчыны на сходзе гэта пытаньне: „ня зможам выканаць, бульба яшчэ стаіць"—гавораць некаторыя.

Ударніца-брыгадзірша Надзя Кажарская ня мае ніводнага дня прагулу, за добрую працу яе прэміяваў калгас. Яна моўчкі некаторы час слухала разважаньні жанчын, потым папрасіла слова.

— Слухайце, бабы, вы ўжо забылі, як досьвіткам уставалі ў сваіх аднаасобных гаспадарках і ішлі мяць на ручных ільнамялках. А зараз у нас машына і пусьцім яе ў ход, не чакаючы канца ўборкі бульбы, толькі трэба захацець.

— Я сама бяруся ўстаць у досьвітку і заклікаю маіх брыгадзірак, да выхаду на бульбу мы зможам 5 гадзін мяць лён. Яе падтрымалі многія і ўпэўнена заявілі, што 50 пудоў ільнавалакна да 7-га лістапада дамо.

Жанчыны калгасу „Чырвоная Полаччына" заявілі, што **не адстануць ад Ляхавіцкага калгасу і дадуць 100 пудоў ільнавалакна да Кастрычніцкіх сьвят.**

Калгасьніцы Ляхав цкага калгасу выканалі сваё абяцаньне. 8 га лістапада доўгаю істужкаю, ня гледзячы на дрэнную дарогу, чырвоны абоз пайшоў у Лепель.

Б.

Лепельскі р.

Як мы арганізавалі буксірную брыгаду

Спазьніліся мы троху з бульбай, лён сьпяшаліся ўпарадкаваць. Замарозкі ўжо на дварэ. Жанчыны па званку раніцаю сьпяшаюцца на поле, сёньня з намі ідуць і мужчыны. Мабілізуем усе сілы на сканчэньне ўборкі бульбы. Дзяржаве адгрузілі бульбу поўнасьцю—5850 пуд.

Пачулі нашы жанчыны, што ў Ляхаўскім калгасе вялікі прарыў 25 *га* бульбы і 28 турнэпсу на полі. Нарадзілася думка, што трэба дапамагчы. Жаночы сход абгаварыў гэта пытаньне і дабраахвотна 18 чалавек выявілі жаданьне ісьці на дапамогу адстаючым.

Жанчыны сваім прыкладам прыцягнулі за сабою і мужчын,—„а ці нам можна"—пытаюць мужчыны на жаночым сходзе і мужчыны далучыліся да жаночай буксірнай брыгады.

Брыгада часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" **Валодзька Юзэфа, Булко Волька і Багдзеева Клаўдзя.**

Калгас Таронкавічы,
Ляхаўск. с.-с., Лепельск. р.

Скончылі малацьбу ўраджаю

Яшчэ да 10-га лістапада 1931 г. камуна „Чырвоны артылерыст", Махіраўскага сельсавету, скончыла малацьбу ярыны. Наогул малацьба прайшла здавальняюча. Гэта тлумачыцца тым, што ў камуне добра пастаўлена сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Усім калгасам трэба браць прыклад з ударнікаў камуны „Чырвоны артылерыст".

Полацкі раён.

Я. Шэф.



Мэханічная пагрузка хлеба з вагону на баржы.

ТАГО НЯ

Аўтар гэтага нарысу—член Беларускай Асацыяцыі ўлетку гэтага году разам з інтэрнацыянальнай бры няй Азіі, вывучаючы сацыялістычнае будаўніцтва ў з кнігі нарысаў тав. Іл. Барашкі

Фергана. Паранжа скінута. Жанчыны-шаўкаводы ў калгасе.

Да рэвалюцыі, калі ня было рэспублікі белага золата, калі ня было Савецкага Узбэкістану, калі Узбэкістан зьяўляўся калёніяй Расійскай імпэрыі, калі эмір бухарскі аддаваў на выкуп цэлыя паветы сваім чыноўнікам, а яны ня лічыліся ні з чым ды накладвалі вялікія падаткі на сваіх падначаленых, было: жанчына-ўзбэчка ня лічылася за чалавека. Такі быў закон. Жанчына — гэта рэч. Чалавек можа кінуць гэту рэч і карыстацца ёю так, як пажадае. Жаданьне жанчыны ня прымалася пад увагу. І калі вырастала ў сям'і дзяўчынка, калі ёй было дзесяць, дванаццаць год, бацька мог прадаць яе за калым, за выкуп таму, хто большы заплаціць калым. Калым выплачваўся натураю. Два-тры вярблюды — калым, добры конь—калым, некалькі авечак — калым, цана за жанчыну. Жанчына была бяспрацоўная. Суд, рэлігія, грамадзтва не парушалі дзікага закону. Яны абаранялі яго, зьдзекуючыся над безабароннай жанчынай Усходу.

Было:

У дванаццаць год дзяўчына-ўзбэчка станавілася нявестай. Чорная, густая сетка—паранжа апускалася на яе твар, і ўжо аж да сьмерці закрывала твар жанчыны. Яна ня мела права выйсьці на вуліцу без паранжы, яна ня мела права паказаць свайго твару другому мужчыне апрача свайго мужа-гаспадара, які купіў яе, у якога яна за рабыню.

Было:

Былі баі—крывапіўцы, кулакі—багацеі, былі батракі. Галіма любіць батрака Мустафу. Яны разам расьлі, яны разам гулялі, яны ня могуць жыць адзін бяз другога. Мустафа, як чорны вол, працуе на баваўняных палёх у бая, ён зьбірае грош да граша, каб выкупіць у бацькі Галіму, каб узяць яе сабе ў жонкі.

А вось прыяжджае да бацькоў Галімы і стары, багаты бай. У яго пяць жонак. Ён дазнаўся, што Галіма расьцьвіла, як ружа, і ягоны батрак Мустафа зьбіраецца ўзяць Галіму ў жонкі. Бай плаціць бацькам Галімы большы выкуп—калым, і Галіма, супроць яе волі, становіцца шостай жонкай бая...

Было:

Шэсьць жонак у багатага бая—шэсьць рабынь, ня маюць яны права аслухацца і ня выканаць загад свайго гаспадара — мужа. З раньняга раньня да позьняй ночы працуюць яны — шэсьць, жонак — на багатага бая. Чуеце, як плачуць кросны, чуеце, як плачуць над доляй сваёй жаночай гэтыя шэсьць рабынь багатага бая, вытыкаючы пэрсыдзкія ўзоры на шоўку...

Было:

Твары ў жанчын-узьбэчак жоўтыя, васковыя. Грудзі ўпалыя, сухотныя, восемдзесят процантаў жанчын былі сухотніцы. У выніку няроўнасьці сьмяротнасьць жанчын была ўдвая большая, чым мужчын. Жаночая палова насельніцтва была меншая. Жанчын не хапала. І ў той-жа час багацеі мелі па чатыры, па шэсьць, сем жонак рабынь...

Было:

Батрак Мустафа помсьціцца багатаму баю за Галіму. Ён выбірае час, бярэ з сабою кесак*), сьцераже бая і, як дзікі шакал, нападае на бая, блішчыць лязо Мустафавага нажа, Мустафа рэжа бая. Мустафа помсьціцца... Мустафу судзяць, як забойцу. Мустафа на судзе гаворыць:—Я зарэзаў бая, бо ён загубіў мае жыцьцё... Мустафу караюць сьмерцю.

Было:

Жанчына была няпісьменнай. Грамата патрэбна багатаму чалавеку, батраку грамата не патрэбна, а тым больш жанчыне—жанчына-ж не чалавек.

Так было.

У горадзе Самаркандзе — страшэнная гарачыня. Сонца не шкадуе сваёй цяплыні, яно стаіць проста над вамі — ценяў няма. Шэсьцьдзесят градусаў гарачыні. На аднэй з вуліц гэтага гораду знаходзіцца жаночы пэдагагічны інстытут. Каля тысячы жанчын навучаюцца тут. Гэта дзіўная ўстанова. Гэта ня звычайная школа. Гэта вышэйшая школа ўсходняй жанчыны. Інстытут аброс дзесяткамі курсаў па падрыхтоўцы ліквідатараў няпісьменнасьці з малапісьменных жанчын, якія ліквідавалі сваю няпісьменнасьць ужо за часы рэвалюцыі.

Мы ўваходзім у двор інстытуту.

Нас сустракае таварыш Мудыра Назірава. Мудыра Назірава смуглявая маладая жанчына — дырэктар інстытуту. Расьпісная цюбіцейка прыціскае яе смалістыя пасмы валос.

Яна нам тлумачыць:

— Наш інстытут мае сваю гісторыю. Існуе з дваццаць другога году. Раней такіх устаноў ва Узбэкістане ня было...

— Да нас у рабфак пры інстытуце прыходзяць дзяўчаты ў паранжах, закрытыя. Мы тут адкрываем жанчыне твар і адчыняем вочы на сьвет.

У гэтых словах — рэвалюцыя быту. Прыходзіць жанчына рабыняй, выходзіць праз шэсьць год свабоднай жанчынай з вышэйшай пэдагагічнай асьве-



Шоўкаматальны цэх фабр

*) Кесак—нож.

БУДЗЕ

ІЛ. БАРАШКА

Пралетарскіх Пісьменьнікаў тав. Іл. Барашка брыгадай пралетарскіх пісьменьнікаў працаваў у Сярэдняй Савецкім Узбэкістане. Нарыс зьяўляецца ўрыўкам „Рэспубліка белага золата".

Фота-здымкі зроблены аўтарам нарысу.

Самарканд. Курсантк'—будучыя настаўніцы у Чайхане.

тай. Гэта адно з вялікіх заваяваньняў Кастрычніка. Вы сабе можаце ўявіць, што робіцца з чалавекам. Ён родзіцца ў другі раз!

— Рэлігія глыбока ўпілася кіпцюрамі старасьвецкай цемры ў целе жанчыны,— гаворыць далей таварыш Мудыра,—і наш жаночы інстытут—сваясаблівасьць Усходу. Калі-б наш інстытут быў зьмешаны, і дзяўчаты вучыліся-б тут разам з хлапцамі, рэлігійныя бацькі ні за што ня пускалі-б дзяўчат вучыцца... Амаль што ўсе нашы студэнткі выходзяць з інстытуту настаўніцамі-камсамолкамі, — нацыянальная форма вучобы і пралетарскі зьмест.

Ёй спадабаўся зроблены ёй вывад, яна ўсьміхнулася і павяла нас у будынак, дзе адбываліся заняткі.

Гэта адны з курсаў. Сюды прышлі жанчыны, каб праз шэсьць месяцаў вярнуцца зноў у свае родныя кішлакі*) ўжо чырвонымі настаўніцамі. Вось сядзіць пэрсіянка-курсантка. Перад ёю кніга, аловак, сшытак, заданьне. Яна так захапілася сваёй работай, што спачатку не заўважвае новых людзей Нарэшце, адрываецца ад работы. Глядзіць на нас сваімі вялікімі прыгожымі вачыма пэрсіянкі. Гэта надзвычай прыгожая, статная дзяўчына прышла з пэрсыдзкай мяжы з камандыроўкай жанаддзелу. Тут скінула чачван**) і паранжу і вярнецца дамоў адкрытай, свабоднай, самастойнай. Яна будзе глядзець ад гэтага часу на людзей, на сьвет, на сонца, не з-пад густой, чорнай сеткі паранжы, з адкрытым тварам. Якая радасьць! Вернецца ў кішлак яна новым чалавекам, і будзе змагацца з цемрай, за новую жанчыну, за новага чалавека—сьвядомага будаўніка сацыялістычнай будучыні...

На курсах вучацца жанчыны. Яны прышлі сюды з дзецьмі. Вось сядзяць дзьве узбэчкі. Перад імі кніжкі, сшыткі, а на руках грудное дзіцянё. Яно п'е малако з матчыных грудзей і і маўчыць. А маці чытае. Чытае прагна, чытае так, як прагна п'е малако з яе грудзей дзіцёнак...

Таварыш Мудыра зноў тлумачыць:

— Да нас прыходзяць з дзецьмі. Дзеці не перашкаджаюць вучобе...

——

— Узбэкістан—рэспубліка белага золата. Белае золата—бавоўна. Ва Узбэкістане—бавоўна ўсё, бо барацьба за бавоўну—барацьба за незалежнасьць Савецкага Саюзу ад капіталістычных краін. Савецкая бавоўна — гэта тое ж золата. Бо чым больш мы маем сваёй бавоўны, тым менш золата мы плацім Эгіпту, Пэрсіі, Турцыі за замежную бавоўну. Сямдзесят машына-трактарных станцый, 67 проц. калектывізаваных гаспадарак рэспублікі, электрыфікацыя Узбэкістану—гэта наша барацьба, — гаворыць мне ў таварыскай гутарцы новая жанчына, былая батрачка, а цяпер намесьнік старшыні ЦВК Узбэкістану—таварыш Джахан Абідава.

Таварыш Джахан едзе ў Бухару з заданьнем: праверыць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі 1931 году. Яна расказвае аб тым, што ўжо за чатырнаццаць гадоў Кастрычніка ва Узбэкістане адкрылася шэсьцьдзесят процантаў жанчын. Яны скінулі з сябе чорнае пакрывала—паранжу. Але сорак процантаў яшчэ закрытыя. Яна расказвае, колькі зьдзекаў і колькі пакут пераносіць жанчына, якая першай у кішлаку скідае з сябе паранжу, і ўрачыста перад вачыма аднасяльчан паліць яе на вогнішчы.., і сьледам за ёю вырываюцца з паранжы яе суседкі...

——

Узбэкістан—рэспубліка шоўку. Магутныя шоўка-матальныя фабрыкі ў Самаркандзе, Фэргане, Бухары, Какандзе, Ташкенце ды іншых гарадоў замянілі сабою стары, дзедаўскі саматужны спосаб размотваньня шаўковых коканаў.

На шоўка-матальных фабрыках асноўны кадр рабочых—жанчыны. Савецкая ўлада ўцягвае жанчыну ў вытворчасьць.

Закрытая, у паранжы прыходзіць жанчына на фабрыку. Першыя дні яна працуе ў паранжы. Нарэшце, новае перамагае, яна скідае паранжу, а дзяцей аддае ў сьветлыя, чыстыя ясьлі... Так складаецца новая жанчына, жанчына - работніца. На шоўка-матальнай фабрыцы „Худжум"*) у Самаркандзе, якая выканала свой прамфінплян на сто сем процантаў за першае паўгодзьдзе 1931 году, наперадзе ўсіх ідзе ўдарная брыгада работніц.

Гэта яна атрымала ганаровы сьцяг за ўдарную працу і вось ужо на працягу году не аддае яго нікому. На фабрыцы работніцы вучацца грамаце. Яны рэгулярна наведваюць заняткі,

(*Канец на 10 стар. зьнізу*)

*) Кішлак—вёска.
**) Чачван—валасяная сетка.

*) Худжум—наступленьне.



фабр. 1 „Худжум" у Самаркандзе.

ТОНА МЯСА З 6-МЕСЯЧНАГА АПАРОСУ

СКАРЫСТАЦЬ ВОПЫТ САЎГАСУ „КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА"

У адозьве ЦК УсеКП(б) і СНК аб разьвіцьці жывёлагадоўлі значнае месца адведзена сьвінагадоўлі—асноўнаму вагару ў вырашэньні мясной праблемы.

Камсамольцы і рабочыя саўгасу імя „Комсомольслой правды" практычна прыступілі да вырашэньня адказьнейшых задач, пастаўленых у адозьве.

Рабочыя саўгасу імя „Комсомольской правды", абгаварыўшы адозву ЦК УсеКП(б) і СНК, намецілі рад канкрэтных мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні яго. У аснову сваіх мерапрыемстваў рабочыя палажылі: вывучэньне тэхнікі сьвінагадоўлі, групавое ўтрыманьне сьвіней, пабудову самакармушак, самакармілак, наладжаньне правільнага кармленьня, асабліва паросных матак і маладняка, забесьпячэньне кармовай базы саўгасу, 100 проц. злучку і барацьбу за захаваньне маладняка.

Рабочы калектыў саўгасу высунуў баявы лёзунг—„тона мяса з 6-месячнага апаросу". Гэты лёзунг рабочых саўгасу стаў лёзунгам барацьбы за ператварэньне ўсіх саўгасаў і СТФ у фабрыкі мяса.

У саўгасе імя „Комсомольской правды" перабудавалася ўся праца. Рабочыя саўгасу з энтузіязмам узяліся за выкананьне ўзятых на сябе абавязацельстваў. Стаў працаваць **гурток па вывучэньні тэхнікі сьвінагадоўлі.** Сьвінаркі і рабочыя саўгасу з вялікай ахвотай наведваюць заняткі. **Тэхнічныя веды з гуртка сьвінаркі пераносяць на практычную працу ў сьвінарнікі і станкі. У саўгасе разгарнулася шырокая хваля сацыялістычнага спаборніцтва.** Заключаны дагавары паміж сьвінарнікамі, цэхамі і падобнымі рабочымі. **Дагавары правяраюцца праз кожныя 3 тыдні.**

Рабочы калектыў саўгасу дабіўся добрых вынікаў працы. Калі ў 1930 годзе саўгас сыстэматычна ня выконваў вытворчага пляну, дык зараз **плян па здачы таварнай прадукцыі ў другім квартале перавыканан на 30 проц. і ў 3-м квартале—на 38 проц.**

Калі ў сакавіку-чэрвені 1931 году адыход па саўгасах Беларусі даходзіў да 30 проц., то ў саўгасе імя „Комсомольской Правды" ён быў зьніжан да 17 проц. Партыйна-камсамольскі і рабочы калектывы саўгасу паставілі задачу—зьнізіць адыход да мінімуму.

Дзякуючы замацаваньню брыгад па сьвінарніках, ужываньню тэхнічных ведаў у практычнай працы, правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі і добраму ўдзелу ў працы камсамольскага калектыву, саўгас дабіўся давядзеньня апаросу да найбольшай вагі. **Дзьве сьвінаматкі саўгасу „Феня" і „Рая", дзякуючы энэргічнай працы брыгады Розы Каплан, у 2-месячным узросьце захавалі апарос першай маткі 12 і другой 10, вагой кожнае парася ў 70—80 кгр.**

Брыгадзірша-камсамолка Роза Каплан павінна стаць прыкладам усім работніцам-сьвінаркам саўгасаў і калгасаў. Перамога брыгады Розы Каплан лішні раз гаворыць аб рэальнасьці лёзунгу, высунутага рабочымі саўгасу імя „Комсамольскай Правды"—тона мяса з адиаго апаросу ў 6-ці месячным узросьце. Да гэтых перамог саўгас прышоў праз правільную арганізацыю працы на сьвінарніках.

Уся рабочая сіла саўгасу разьбіта па брыгадах, на чале якіх стаяць старшыя брыгадзіры. Кожная брыгада замацавана за сталым вучасткам працы сьвінарніка і нясе адказнасьць за матак і маладняк. **Раней кожная сьвінарка абслугоўвала 20 сьвінаматак і ледзь спраўлялася з працай. Зараз яна абслугоўвае 25 сьвінаматак і добра спраўляецца, адначасова павышае якасьць догляду. У саўгасе поўнасьцю ліквідавана абязьлічка. Уся праца па доглядзе сьвіней пераведзена на зьдзельшчыну.** Уведзена зьдзельна-прэміяльная аплата працы. За лепшы догляд сьвінаматак і маладняка, за сваячасовую злучку ўстаноўлена прэмія ў разьмеры 1-го рубля, за нармальны апарос і захаваньне парасят установлена прэмія ў разьмеры 50 кап. За ліквідацыю ўпадку і вымушанага ўбою на працягу месяца сьвінарка атрымлівае 15 руб. прэмію. Гэта сыстэма значна павысіла зацікаўленасьць рабочых у працы. Вось тыя шляхі, па якім ішоў саўгас імя „Комсамольской Правды" да перамог. Гэтыя перамогі пакуль што адзіночныя, яны павінны быць памножаны і вопыт працы саўгасу трэба перанесьці ва ўсе сьвінагадоўчыя саўгасы і калгасы Беларусі.

У вырашэньні задач пасьпяховага разьвіцьця сьвінагадоўлі вялікая значэньне павінна адыграць жанчына-сьвінарка, як непасрэдны працаўнік па сьвінарніку.

Ударніцы-сьвінаркі калгасаў і саўгасаў, памятайце, што лёзунг саўгасу імя „Комсамольской Правды" забясьпечвае пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўрадам у вырашэньні мясной праблемы. **Скарыстайце ў сваёй працы вопыт саўгасу імя „Комсамольск. Правды".**

Курбацкі.

Аршанскі раён, саўгас імя „Комсомольской Правды".

„ТАГО НЯ БУДЗЕ"

(*Канец нарысу*)

чытаючы ў лемантарох новыя песьні:

„Шыйце, шыйце,
Шыйце, шыйце,
Нашывайце!

Пяць ў чатыры,
Пяць ў чатыры,
Вышывайце!

——

Было—страх як было...

Работы яшчэ, ой як багата!

Паранжы паляцца на агнёх. Баі - багацеі ліквідуюцца як як кляса. Савецкая ўлада, абараняючы жанчыну, забараніла аддаваць яе замуж да шаснаццаці гадоў. Рэвалюцыйная законнасьць карае многажонства. Друк, суд, пралетарская грамадзкасьць—усё настаўлена на абарону правоў свабоднай, роўнапраўнай жанчыны Усходу.

Таго, што было, ня будзе.

Нараджаецца на Ўсходзе новая свабодная жанчына!

МАСАВАЯ ПРАЦА СЯРОД ЖАНЧЫН ПАТРАБУЕ КІРАЎНІЦТВА

Разгорнутая масавая праца сярод жанчын—калгасьніц і аднаасобніц забясьпечыць пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй і ўладай у галіне калгаснага будаўніцтва.

Рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі—саўгасаў і калгасаў—высунуў новыя масы жаночага актыву, які патрабуе кіраўніцтва з боку партыйных і мясцовых арганізацый. На жаль, гэта кіраўніцтва далёка невыстарчальнае, аб чым гавораць допісы селькорак з месц.

Бурносаў і Ванюшоў пішуць, што „на тэрыторыі Цяцерынскага сельсавету (Бялыніцкі р.) знаходзяцца дзьве партыйныя ячэйкі (саўгасная і пры сельсавеце), яны не зварачваюць увагі на культурна-масавую работу сярод калгасьніц. Як вынік гэтага, жанчыны Цяцерынскага сельсавету ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў сацбудаўніцтве".

З Талачына паведамляюць, што Талачынская парт'ячэйка жанработай ня цікавіцца і нават ня вылучыла жанарганізатара.

Ячэйкі Дубровенскага раёну працай дэлегацкіх сходаў зусім ня кіруюць, ставячы гэту працу на апошняе месца, паведамляюць **Шульман і Ліпкіна.**

Ганебныя адносіны да жанпрацы пануюць у Лепельскім райкоме. Там поўная абязьлічка ў галіне жаночай працы і ніхто ў ім ня хоча займацца. Прапагандыстка Васэрман заявіла: „Я цярпець не магу жаночай працы і займацца ёю ня буду". У выніку такіх адносін раённая жаночая канфэрэнцыя 3 разы склікалася і 3 разы зрывалася, бо людзі з вёсак не зьявіліся. Усё гэта сьведчыць аб яўна апартуністычнай недаацэнцы масавай працы сярод жанчын ў Цяцерынскім сельсавеце, Бялыніцкага раёну, у Талачыне і Лепельскім раёне.

Дэлегацкія сходы ў радзе калгасаў і саўгасаў працуюць дрэнна. Асноўная прычына гэтага—адсутнасьць кіраўнікоў і слабое кіраўніцтва з боку партыйных арганізацый.

П. Харытановіч з Старых Дарог піша: „праца сярод дэлегатак калгасу імя Сталіна і аднаасобніц вёскі Паставічы адсутнічае. Два дэлегацкія сходы беларускі і яўрэйскі ў мястэчку Старыя Дарогі амаль зусім не працуюць. Дэлегаткі ня прымалі ўдзелу ў асеньняй сяўбе і ўборцы бульбы. Наведваньне сходаў зусім дрэннае".

Патрэбна большая ўвага з боку партыйных арганізацый пытаньню перабудовы працы дэлегацкіх сходаў. Слабая праца раду дэлегацкіх сходаў не дала магчымасьці падрыхтаваць больш актыўных калгасьніц у партыю. Мазырскі, Лепельскі, Дубровенскі дэлегацкія сходы не падрыхтавалі ніводнай дэлегаткі ў партыю.

Тав. Карвацкая—старшыня нацыянальнага літоўскага с.-с. (Мальхаўскі).

Раённы друк, які мог-бы адыграць вялікую ролю ў разгортваньні масавай працы, у радзе раёнаў замоўчвае гэта пытаньне (Бялыніцкая раённая шматтыражка, Лепельская „Калгасная праўда". Пара ўжо працу сярод жанчын у вышэй прыведзеных калгасах і раёнах перавесьці з задворкаў і аддаць ёй належную ўвагу.

Бярэце прыклад з Асьвейскіх дэлегатак

Дэлегаткі Асьвейскага раёну арганізавалі вакол сябе аднаасобную бядняцка-серадняцкую масу жанчын, арганізавалі 4 чырвоных абозы, здалі дзяржаве звыш пляну—102 цэнтнэры бульбы ў падарунак 14-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 2 чырвочых абозы ў 85 цэнтнэраў адпраўлены Ленінградзкім рабочым сумесна з камсамольскім эшалёнам.

У калгасах „На варце ленінскага шляху" і „Колас Калініна", складзены з 15 дэлегатак 2 брыгады, якія па ўдарнаму працуюць ужо больш тыдня па падняцьц! зябліва. **Мацкевіч.**

Плян перавыканалі

Калгас „Камінтэрн" (Стара-Дароскі раён) сапраўды па ўдарнаму змагаецца за выкананьне ўсіх гаспадарча-палітычных задач. Шырока ўжываючы сацыялістычныя мэтады працы—сацспаборніцтва, і ўдарніцтва, плян азімага севу выкананы на 100 процантаў, засеяна 24 *га*, узьнята зябі 42 *га*, або 107 проц. заданьня. Здадзена дзяржаве 11 тон бульбы (плян 10 тон).

Звыш пляну здадзена дзяржаве—у падарунак XIV гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі 2 тоны бульбы і 1 тоны саломы.

Алесь Лубін.

Слуцкі раён.



Школа ў калгасе.

Больш увагі жанрабоце

У Мазырскім раёне ёсьць значныя зрухі ў жанрабоце ў параўнаньні з мінулым годам. Узрасла актыўнасьць жанчын у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній.

Але ў радзе ячэек дэлегацкія сходы працуюць зусім дрэнна, а ў некаторых існуюць толькі на паперы. Слабадзкая ячэйка на працягу году ні разу ня слухала справаздачы кіраўніка дэлегацкага сходу. За год было праведзена 3 сходы і на гэтым кропка.

На заводзе „Пралетары" абмежаваліся толькі тым, што выбралі дэлегатак, Якімавіцкі, Капліцкі, Прудкаўскі і Аўцюкоўскія дэлегацкія сходы зусім не працавалі. Сакратар ячэйкі Мароз (Аўцюкі) лічыў, што ёсьць павжней справы, чым займацца з дэлегаткамі. У камуне „Авангард" зусім адсутнічае сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ў радзе ячэек Мазырскага раёну яшчэ да гэтага часу існуе недаацэнка работы сярод жанчын.

Неабходна рашуча ўдарыць па зрыўшчыках работы дэлегацкіх сходаў.

Л. К.

Ніводнай няпісьменнай жанчыны

Чэрвенская раённая канфэрэнцыя правільна паставіла пытаньне аб вучобе жанчын. Канфэрэнцыя ўзяла на сябе абавязак уцягнуць усе 100 проц. няпісьменных і малапісьменных жанчын у раёне ў лікбезы і школы малапісьменных.

Для забесьпячэньня 100 проц. наведваньня лікбезу і школ канфэрэнцыя вынесла пастанову, каб ясьлямі, дзіцячымі садамі і дзіцячымі пакоямі абслужыць навучаючыхся матак. Трэба, каб гэтыя прапановы, якія прыняты на канфэрэнцыі, не засталіся на паперы, а былі праведзены ў жыцьцё.

Самі жанчыны, асабліва дэлегаткі, павінны прасачыць за гэтым. Дэлегаткі павінны прыняць актыўны ўдзел у працы культсаветаў на мясцох і штабу па лікбезу, каб забясьпечыць выкананьне пастаноў раённай канфэрэнцыі.

К.

Выклікаем на сацспаборніцтва Слабодзкі дэлегацкі пункт

На сходзе калгасьніц калгасу „Правда" Мазырскага раёну прысутнічала больш 85 проц. калгасьніц. Абгаварвалі работу дэлегацкага сходу. Крытыкавалі і

Делегаткі-шахцёркі Донбасу

гаварылі як палепшыць работу.

На сходзе былі выпрацаваны ўмовы па сацспаборніцтву наступнага зьместу:

1. Мы дэлегаткі і калгасьніцы калгасу „Правда" ўключаемся ў месячнік апрацоўкі і здачы (продаж) дзяржаве тэхнічных культур, абавязваемся апрацаваць і поўнасьцю здаць дзяржаве лён не пазьней 5-га сьнежня гэтага году.

2. Бярэм на сябе абавязак падпісацца на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" і завербаваць 50 падпісчыкаў. Па ўсім гэтым пытаньням выклікаем на сацспаборніцтва Слабодзкі дэлегацкі сход.

Тут-жа на сходзе 18 калгасьніц падпісаліся на часопісь.

Для правядзеньня далейшай падпіскі выбраны ўпаўнаважаныя: **Душаткіна і Салтыкова.**

Бярэце прыклад з калгасьніц калгасу „Правда".

Коцік.

Ударніцы па распаўсюджваньні „Работніцы і Калгасьн. Беларусі"

3-га лістапада былі абраны ўпаўнаважаныя па падпісцы на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі", калгасьніцы: **Бененсон** Фрада і **Качан** Прося. За адну дэкаду, пяцідзесяцігадовая калгасьніца-ўдарніца Бененсон Фрада, якатолькі ў гэтым годзе ліквідавала няпісьменнасьць, завербавала 19 падпісчыц на часопісь, з якіх большасьць на год і паўгода. Бененсон працягвае працу па вярбоўцы. „Я патрою падпіску"—заявіла яна. Калгасьніца **Качан Прося** завербавала **32 падпісчыцы.** Бярыце прыклад ад ударніц Бененсон і Качан.

Мазырскі р. **Коцік.**

Ударная брыгада работніц на заводзе „Электрык" у Маскве.

КАЛГАСЬНІЦА ПАВІННА ПРЫМАЦЬ АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ У МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ

Мабілізацыя сродкаў у калгасах адыгрывае вельмі вялікую ролю ў справе разгортваньня калгаснага будаўніцтва і паляпшэньня дабрабыту самых калгасных мас. Сабраныя сродкі калгасьнікаў ідуць у першую чаргу на задавальненьне патрэб саміх калгасаў.

Зьбіраючы з калгасьнікаў уступныя ўзносы, калгас атрымлівае магчымасьць папаўняць свае зваротныя сродкі на набыцьцё машынных прылад, угнаеньня і на задаваленьне іншых гаспадарчых патрэб.

Зьбіраючы мэтавыя ўзносы, калгас пазычае вольныя грошы ў калгасьнікаў пад процанты да новага ўраджаю, якія ён таксама пускае на набыцьцё розных сродкаў вытворчасьці—машын, абсталяваньня, угнаеньня і інш.

Рэалізуючы акцыі Трактарацэнтру, калгас гэтым самым стварае магчымасьць пабудовы або пашырэньня ў сваім раёне машына-трактарнай станцыі, бо МТС будуюцца на сродкі, што зьбіраюцца ад продажу акцый Трактарацэнтру.

Рэалізуючы пазыку сярод калгасьнікаў і папаўняючы ўзносы па пазыцы, калгас дапамагае хутчэйшай індустрыялізацыі краіны і стварае магчымасьць свайму сельсавету і райвыканкому больш атрымаць сродкаў на будаўніцтва ў калгасах: больніц, ясьляй, лазьняў, жылых памяшканьняў і на ажыцьцяўленьне іншых мерапрыемстваў, бо з атрыманых сродкаў па пазыцы 30 проц. адлічваецца ў бюджэт сельсавету і 20 проц. у бюджэт райвыканкому на паказаныя мэты. Апрача таго, заплаціўшы ўзносы па пазыцы, калгасьнік атрымлівае аблігацыю, па якой кожны год нарастаюць процанты, і прымае ўдзел у выйгрышах.

На набыцьцё машын, будаўніцтва ясьляй, лазьняў, жылых памяшканьняў у першую чаргу накіроўваюцца мабілізаваныя сродкі.

Калгасьніца павінна ведаць, што ад посьпеху ў мабілізацыі сродкаў паляпшаюцца яе бытавыя ўмовы. У гэтым жанчына-калгасьніца павінна быць зацікаўлена. На жаль, калгасьніца зусім слаба ўцягнута ў справу мабілізацыі сродкаў. Зусім малы процант калгасьніц уцягнут у калгасныя камісіі садзейнічаньня распаўсюджваньню пазыцы, у кадры грамадзкіх інструктароў.

Тав. Воўкава правяла падпіску на пазыку па жакту № 7

Роля калгасьніцы ў справе мабілізацыі сродкаў надзвычай вялікая, ад яе ўдзелу ў значнай ступені залежыць посьпех правядзеньня ў калгасах кампаніі па мабілізацыі сродкаў.



Новапабудаваная сілосная вежа.

На дэлегатак усебеларускага зьезду калгасьніц ускладаецца адказьнейшая задача—растлумачыць усім калгасьніцам значэньне справы мабілізацыі сродкаў і дабіцца актыўнага ўдзелу калгасьніц у выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, а праз гэта і ў выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Асмалоўскі.

Патрэбна зьнішчыць бязадказныя адносіны да жывёлы

Становішча аборы ў саўгасе „Косіна“ немагчыма агіднае. Аборы, у якіх стаяць каровы, паўнюткі бруду. Да таго сярод аборы выкапана канава, якая напоўнена жыжкай, і каровы заўсёды могуць паламаць сабе ногі.

У мінулым годзе з-за бруду і нядбайных адносін загінула каля 50 кароў. У гэтым годзе з-за нядогляду аб'елася канюшынай 5 кароў.

Для падмываньня вымя анучак не выдаюць, і даяркі выціраюць вымя каровам сваімі хвартухамі. Ні рабачком, ні партячэйка, ні адміністрацыя не зварачаюць на гэта ніякай увагі.

Калі і надалей застанецца такое становішча, дык **пад пагрозай стаіць стада ў 300 штук малочнай жывёлы.**

Трэба тэрмінова зьнішчыць злачынныя бязадказныя адносіны да жывёлы. Гэтым павінны зацікавіцца адпаведныя органы.

Ударніцы саўгасу: **Пляшкевіч Вікця. Трусакевіч.**

Лагойскі раён.

ЗА ЛЕПШУЮ ЯКАСЬЦЬ ДОГЛЯДУ ЖЫВЁЛЫ

Па ўдарнаму ліквідаваць прарывы па якасьці прадукцыі

(УНУТРЫФАБРЫЧНЫ РЭЙД)

Рэйд па праверцы якасьці прадукцыі на фабрыцы „8-га сакавіка“ (Менск) выявіў шмат фактаў выпуску нядобраякаснай прадукцыі. Ярлычніцы часта зьмешваюць нумары і таму перамешваюцца колеры. Куртка можа быць чорная, а рукаў сьветлы. Напрыклад, у 15 фасоне 4-ай групы падборты бываюць карацей за палу і потым атрымліваюцца на полах складкі. У гэтым-жа фасоне інструктар **Мадэлеўскі** і кантралёр **Арончык** прапусьцілі пачку талстовак без паясоў. Прафорг **Марголіна** не рэагавала на такія зьявішчы.

Ня гледзячы на тое, што прасавальшчыкі ня цэлы дзень нагружаны працай, якасьць прасаваньня нікуды ня вартая. Пасьля прасаваньня прадукцыя кідаецца абыяк, губляе выгляд і вартасьць. Гузікі ў 16 і 4-м фасоне рознага колеру і прышываюцца як на сьмерць. У 4-м і 15-м фасоне адсутнічае стандартная верхняя строчка. Работніца **Капылова** да курткі нумар 34 прышывае 40 нумар рукавоў.



Гаспадарча-разьліковая брыгада шчотачнай ф-кі імя Крупкай (Менск), выканала прамфінплян на 203 проц.

Закройны цэх—гэта сэрца фабрыкі. Тут бярэ пачатак кепская якасьць прадукцыі. Няправільныя раскроі даюць у выніку зьвужаныя каўняры, кішэні не адпавядаюць велічыні штаноў. Часта бывае, што галоўка рукава зусім адразаецца, прыклады даюцца няправільна.

Працдысцыпліна на фабрыцы заняпала. Напрыклад, у першым фасоне малююць у часе працы розныя малюнкі, потым імі кідаюцца, і ўсё гэта зрывае работу. Інструктар **Файнбэрг**, працуючы ў гэтым фасоне, на гэта не зварачвае ўвагі. Сырэц, які ідзе ў зайкройны цэх, не правяраецца (даўжыня і шырыня), гэта дае вялікую страту ў эканоміі матар'ялаў. Адміністрацыя слаба рэагуе на кепскую якасьць прадукцыі. Напрыклад, яна не праводзіць у жыцьцё прапанову рабочых—вылічваць за кепскую якасьць.

Фабком вельмі многа кажа і выносіць пастаноў аб паляпшэньні якасьці прадукцыі, але-ж яны слаба праламляюцца на працы і зусім не правяраюцца. Партыйны калектыў змагаецца за якасьць прадукцыі, але-ж слаба.

У далейшым неабходна ўвесьці матар'яльную адказнасьць інструктароў-прыёмшчыкаў, кантралёраў за прапушчаную кепскую якасьць. Устанавіць жорсткі самакантроль над ходам працэсаў. Прафоргі кожны дзень павінны зьмяшчаць у штодзенках зрыўшчыкаў якасьці і вывешваць на відным месцы. Інструктары і брыгадзіры павінны добра прасачыць за канкрэтнымі зрыўшчыкамі добрай якасьці і аддаваць сьпісы ў кантору для вылічэньня. Трэба праз насьценгазэты і штодзенкі перадаваць вопыт барацьбы за якасьць прадукцыі 30 фасону, а таксама лепшых ударнікаў і ударніц, арганізаваць на фабрыцы тэхвучобу, зрабіць касу прагульшчыкаў.

Парткалектыву і фабкому неабходна правяраць выкананьне сваіх пастаноў па паляпшэньні якасьці прадукцыі.

Група ўдарніц часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ і насьценгазэты „Барацьбіт за якасьць“:

Шмідт, Любнэр, Кэйлер, Чэрчэс, Куніна.



Гаспадарча-разьліковая брыгада швэйнай фабрыкі імя К. Цэткін, якая выканала вытворчую праграму на 120 проц. (Масква).

ПЕРАБУДАВАЦЬ БЫТ У КАЛГАСАХ

За 100 проц. выхад калгасьніц на работу

Першы ўсебеларускі зьезд калгасьніц будзе мець вялізарнейшае значэньне ў першую чаргу ў справе замацаваньня тых пазыцый, якія заваяваны намі на фронце сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Гэты зьезд павінен даць значны штуршок уперад у справе ўцягненьня ўсёй масы калгасьніц у актыўную работу па будаўніцтве калгаснай гаспадаркі.

Яшчэ да гэтага часу мы маем ня мала такіх фактаў, калі значная частка калгасьніц ва многіх калгасах ня прымае актыўнага удзелу ў працы з тае прычыны, што яны зьвязаны з малымі дзецьмі і кухняй. Мы ведаем ня мала такіх фактаў, калі ў самую гарачую пару сяўбы, праполкі, уборкі многія калгасьніцы, якія шмат карысьці маглі-б прынесьці ў полі, сядзелі дома ля сваіх дзяцей, ля сваёй печы, гатуючы сьнеданьне і вячэру сваім „мужыком". Такія факты ёсьць і цяпер, калі рабочыя рукі ў калгасах так патрэбны, асабліва ў ільнаводчых калгасах, у якіх павінна кіпець работа па першапачатковай апрацоўцы ільну.

Такія зьявішчы бязумоўна зьяўляюцца ненармальнымі і недапушчальнымі, бо яны прыносяць ня мала шкоды гаспадарчаму стану калгасаў, не гаворачы ўжо аб тым, што такія калгасьніцы пазбаўляюцца ня мала працадзён і шмат трацяць ад гэтага матар'яльна.

Трэба вызваліць калгасьніцу ад калыскі і кухні і тым самым даць ёй поўную свабоду і магчымасьць стаць актыўным удзельнікам у справе вялікай будоўлі калгаснай гаспадаркі нароўні з іншымі калгасьнікамі. Трэба перабудаваць стары быт сёньнешняй калгасьніцы—учарайшай аднаасобніцы. Рашуча пакончыць з тэй коснасьцю, якая яшчэ пануе ва многіх калгасах у гэтым пытаньні, з тэй опортуністычнай недаацэнкай значэньня гэтага пытаньня, якое яшчэ існуе ва многіх кіраўнікоў калгасаў.

Пабудаваць дзіцячыя ясьлі, пляцоўкі, агульныя сталоўкі можна амаль у кожным калгасе, і пры наяўнасьці жаданьня іх можна добра абсталяваць, каб было і здорава, і прыгожа, і культурна. Але-ж у гэтым напрамку не разварушыліся.

Прыклад можна ўзяць з калгасу імя Чарвякова (Мсьціслаўскі раён). Тут ёсьць і ясьлі, і пляцоўкі, і сталоўкі, ды яшчэ як абсталяваныя! Бацькі зусім спакойны за сваіх дзяцей бо яны ведаюць, што іх дзеці і ў чыстаце, і ў парадку, і сваячасова накормлены, і сваячасова гуляюць і г. д. Ніхто тут і не клапоціцца аб сьнеданьні і вячэры, бо ўжо вядома, што ёсьць каму клапаціцца—ёсьць сталоўка. Тут няма „гуляючых" калгасьніц, усе дружна працуюць. Не дарэмна гэты калгас зьяўляецца адным з лепшых сярод калгасаў БССР, ён заўсёды з посьпехам спраўляецца з усімі сваімі задачамі, заўсёды перавыконвае свае плянавыя меркаваньні ў справе сяўбы, уборкі, загатовак і атрымлівае кожны год прэмію.

Такога становішча можна дабіцца ў кожным калгасе, трэба толькі аб гэтым паклапаціцца.

Зьезд калгасьніц павінен па гэтым пытаньні сказаць рашаючае слова, каб разварушыць усіх тых кіраўнікоў калгасаў, якія яшчэ самі жывуць і працуюць па-старому.

Але, на жаль, ня ўсе кіраўнікі калгасаў падыходзяць правільна да пытаньня перабудовы быту. Мы маем факты, калі ў радзе калгасаў ясьлі прышлося закрыць, бо маткі не хацелі несьці сваіх дзяцей у ясьлі (калгас „Бязбожнік", Лёзьнянскага раёну, Ратамскі калгас і калгас „Чырвоны спэцыяліст", Менскага раёну).

Якая прычына такога зьявішча? Першая і асноўная прычына—гэта адсутнасьць падрыхтоўчай, растлумачальнай працы сярод жанчын і наогул слабасьць масавай працы. Часта з боку праўленьняў калгасаў наглядаюцца вельмі няўважлівыя адносіны да справы арганізацыі ясьляй (Ляхаўскі калгас, Лепельскага раёну). Пад ясьлі адпускаюць непадыходзячае памяшканьне, падлога гнілая, вокны выбіты, не сачаць за нармальным забесьпячэньнем ясьляй прадуктамі, за санітарным становішчам іх.

Трэба, каб справай арганізацыі ясьляй і пляцовак зацікавіліся-бы самі калгасьніцы, каб уся грамадзкасьць прыйшла ім на дапамогу.

Ужо цяпер праўленьні калгасаў, а таксама і райкалгассаюзаў павінны распачаць падрыхтоўчую працу і энэргічна ўзяцца за плянавую работу па арганізацыі дзіцячых ясьляй, пляцовак, сталовак, каб у наступную веснавую пасеўную кампанію ўсе калгасьніцы былі заняты актыўнай творчай працай па ажыцьцяўленьні тых баявых задач, якія перад намі высоўвае наша комуністычная партыя і наш савецкі ўрад.

М. Калмык.

Першы дзень у школе. Стрыжка дзяцей.

ПАВЫСІМ РОЛЮ ПРАЦОЎНЫХ ЖАНЧЫН У ГРАМАДЗКІМ І ВЫТВОРЧЫМ ЖЫЦЬЦІ КРАІНЫ

Бытавыя ўстановы—на службу сацыялістычнаму будаўніцтву

Сетка ясьляй пашырылася

Да 1930 году бытавы камітэт пры РВК не працаваў. Работа толькі пачынаецца з 1931 году. Цяпер ужо можна гаварыць аб выніках.

Да веснавой сяўбы былі праведзены курсы па падрыхтоўцы загадчыц ясьляй. Была таксама праведзена раённая жаночая канфэрэнцыя. Па пляне трэба было адкрыць у раёне 26 ясьляй, а адкрыта—50. На зімовы час замацавана 20 ясьляй. У мінулым-жа годзе было ўсяго 17 летніх ясьляй, з іх адны пастаянныя. Акрамя ясьляй былі арганізаваны 3 пастаянныя дзіцячыя сады.

Тры лепшыя калгасьніцы, бядняцкі і сераднячкі былі вылучаны загадчыцамі ясьляй. Ясьлі сябе апраўдалі. Там, дзе яны былі арганізаваны, быў добры выхад жанчын на працу. Жанчыны былі актыўнымі ўдзельніцамі ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях, якія праводзяцца ў раёне.

У ясьлях была праведзена культурна-выхаваўчая праца сярод жанчын. У часе падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі была нарыхтавана загадчыц ясьляй, дзе абгаварвалася пытаньне аб падрыхтоўцы калгасьніц да ўборачнай.

Ня гледзячы на дасягненьні, трэба адзначыць, што з боку МТС, райкалгассаюзу ня была зьвернута ўвага на дзіцячыя ўстановы. Яны лічаць, што ясьлі і пляцоўкі ня іх справа. Райспажыўсаюз мала зьвярнуў увагі на забесьпячэньне ясьляй, пляцовак і дзіцячых садоў. У ясьлях не хапае кухоннага і сталовага начыньня. А ў каапэрацыі такое начыньне ёсьць. Ясьлі не забясьпечаны поўнасьцю харчаваньнем, абсталяваньнем, вопраткай, абуткам. Бытавыя сэкцыі пры сельсаветах таксама мала аддаюць увагі дзіцячым установам.

В. Конюх.

Койданаўскі раён.

Сродкі скарыстаны не па прызначэньні

У часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы па лініі РВК былі адпушчаны сродкі на арганізацыю сталовых у калгасах. Але ня ўсюды яны адчынены. Не скарыстаны сродкі для набыцьця абсталяваньня. Гэтыя сродкі былі скарыстаны на іншыя справы. Напрыклад, калгас „Новае жыцьцё" атрымаў 1.000 рублёў на арганізацыю сталоўкі, а скарыстаў 700. Тое-ж самае было і па іншых сельсаветах. Справа аб нескарыстаньні сродкаў па прызначэньні накіравана пракурору для прыцягненьня да адказнасьці вінаватых, але да гэтага часу вынікаў няма.

В. К.

Койданаўскі раён.

Ясьлі пры Віцебскай панчошнай ф-цы імя К. Цэткін.

Справы ясельныя

На Віцебскім фанерным заводзе будуюцца дзіцячыя ясьлі, але па словам старшыні фабкому яны сёлета ня будуць скончаны.

Гэтага нельга дапусьціць, бо ёсьць усе магчымасьці скончыць у гэтым годзе пабудову ясьляй, толькі трэба каму належыць паклапаціцца і нажаць.

Н.

Праз 2-месячныя курсы падрыхтоўваюцца польскія настаўніцы.

* * *

На фабрыцы „Дзьвіна" вельмі кепска з пабудовай ясьляй. Старшыня фабкому заяўляе, што няма будаўнічых матар'ялаў, не хапае рабочае сілы.

З гэтым адказам згадзіцца нельга. Ясьлі павінны служыць выкананьню прамфінпляну. На фабрыцы не хапае кваліфікаванай рабочай сілы, а кваліфікаваныя работніцы сядзяць дома, бо няма куды дзяваць дзяцей.

Нікалаева.

сьлі калгасу „Чырвоны Дуб".

НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫСОКІ ЎРАДЖАЙ

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на падставе няўхільнай барацьбы з правымі і „левымі“ ўхілістамі, нячуванымі тэмпамі пашыраны старыя і арганізаваны новыя калгасы і саўгасы, якія пашырылі пасеўную плошчу па найбольш працаёмкіх культурах, перавысіўшы тэмпы пашырэньня пасеўных плошчаў царскай Расіі ў 7 раз і тэмпы пашырэньня пасеўнай плошчы аднаасобнікаў амаль у 2,5 разоў.

Мы маем значныя посьпехі ў галіне арганізацыі працы, ёсьць шмат бліскучых прыкладаў узорнай арганізацыі працы ў МТС, саўгасах і калгасах. Аднак, яшчэ слаба разгортвалася саўгасамі і калгасамі барацьба за ўраджай, за якасныя паказальнікі ў сельскай гаспадарцы.

У барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў вялікую ўвагу трэба аддаць барацьбе за ўраджай. Сваячасовае і добраякаснае правядзеньне ўсіх прасьцейшых аграмерапрыемстваў павінна стаць правілам нашай работы.

Падрыхтаваць належным чынам насеньне да веснавой сяўбы—гэта значыць адабраць насеньне з лепшых вучасткаў, найменш засьмечаных і пашкоджаных, з найбольш буйным зернем, адсартаваць зараз-жа, не чакаючы вясны, ня толькі праз адну простую сартыроўку, а абавязкова праз трыер; зараз-жа абмяняць звычайнае насеньне на гатунковае з загатоўчымі арганізацыямі або з суседнімі саўгасамі і калгасамі. Стварыць адпаведныя ўмовы хаваньня яго ў чыстых і сухіх, добра праветраных памяшканьнях з папярэджаньнем зьмешваньня як культур, так і гатункаў.

Устанавіць пастаянны нагляд за насенфондамі сыстэматычны догляд за становішчам насеньня, прымацаваўшы адказнага за гэту справу калгасьніка, завесьці ў гаспадарцы, у раёне добры ўлік гатунковага насеньня, сачыць за поўным яго скарыстаньнем на насенныя мэты, а не на фураж. Высяваць выключна насеньнем, праверaным на ўсхожасьць, чыстату, а на працягу зімы правяраць вільготнасьць, безадкладна прымаючы меры папярэджаньня гарэньня і наогул псаваньня насеньня, абавязкова пратруціць насеньне ад галоўні перад сяўбой. Выразнае правядзеньне гэтых правіл павысіць ураджай ня менш як на 20 проц. у сярэднім.

Апрача таго кожны калгасьнік павінен клапаціцца ўжо ў пачатку аб тым, каб поўнасьцю скарыстаць усё насеньне траў, кораньплодаў, гародніны, што засталося пасьля здачы дзяржаве як у самім калгасе, так і ў паасобных калгасьнікаў, вядучы рашучую барацьбу з момантамі разбазарваньня і безгаспадарчага зьнішчэньня насеньня.

Ужо зараз павінны быць адабраны і добра захаваны кожным калгасам высадкі на насеньне кораньплодаў і гародніны ў разьмерах, якія поўнасьцю забясьпечылі-б калгас насеньнем гэтых культур у 1933 годзе. Трэба ўжо прыступіць да **прапрацоўкі севазвароту** ў кожным калгасе з тым, каб на вясну ня было ніводнага калгасу без устаноўленага ў сувязі з напрамкам яго гаспадаркі спэцыялізаванага севазвароту, цалкам адпавядаючага вымаганьням галоўнай культуры яго.

Пытаньне ўгнаеньня зьяўляецца асноўным пытаньнем, і тут асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць, пры ўмовах бясспрэчнага скарыстаньня ўсіх адпускаемых прамысловасьцю мінэральных угнаеньняў, на пытаньні тэхнікі ўнясеньня іх. Трэба рэгуляваць нормы ўгнаеньня ў адпаведнасьці з якасьцю глебы (большыя нормы і больш буйны гной — на больш цяжкіх глебах і наадварот), безадкладнае заворваньне яго пасьля вывазу на поле, адначасовае ўнясеньне гною з вапнай і мінэральнымі ўгнаеньнямі, правільнае, роўнамернае раскідваньне гною, вапны і ўгнаеньняў па полі, абавязковае прыстасаваньне паасобных відаў угнаеньняў да запатрабаваньняў глеб, паасобных культур, максымальная мабілізацыя ўгнойваючых рэсурсаў унутры гаспадаркі (загатоўка торфу на подсьціл, попелу і г. д.). Правільна праведзенай працай па ўгнаеньні можна падняць ураджай на 50 проц.

Надзвычай важным мерапрыемствам зьяўляецца добраякасная апрацоўка глебы. Сваячасова праведзенае на адпаведную глыбіню ворыва, раньняе зяблева і ворыва папару з далейшай правільнай апрацоўкай (дыскаваньнем, баранаваньнем і г. д.)—дадуць магчымасьць падняць ураджайнасьць на 15 проц. А між тым да гэтага часу на якасьць апрацоўкі глебы не зварачалася амаль ніякай увагі.

Чым можна тлумачыць расьцягваньне веснавой сяўбы на паўтары месяцы ў радзе калгасаў, калі яна павінна быць закончана за 20 дзён. Толькі тым, што ў асноўным сяўба праводзілася па веснавым ворыве (на зяблева ў 1930 годзе было паднята вельмі мала зямлі), а таксама вельмі кепскай арганізацыяй працы. З расьцягваньнем сяўбы зьвязана і расьцягваньне тэрмінаў уборкі, а ў выніку паніжэньне ўраджайнасьці і значныя страты ад несваячасовай уборкі. Пытаньне сваячасовай сяўбы забясьпечваецца выкананьнем плянаў зяблевага ворыва, правільнай расстаноўкай сіл, правільнай арганізацыяй працы на пэрыяд сяўбы паводле суровага каляндарнага рабочага пляну.

Усе гэтыя пытаньні павінны быць прапрацаваны на нарадах брыгад, агульных сходах за зімовы час. Правядзеньне гэтых мерапрыемстваў дасьць значны эфэкт, павысіўшы ўраджайнасьць да 50 проц. і больш.

Радковая сяўба, акрамя павышэньня ўраджайнасьці на 10—15 проц., дае эканомію насеньня



Малацьба аўсу ў калгасе імя 12 зьезду КП(б)Б, Талачынскага раёну.

да 25—30 проц. Таму справе максымальнага скарыстаньня ўсіх існуючых у раёне сявярак павінна быць удзелена ўся ўвага ў надыходзячую веснавую пасеўную кампанію.

Рад мерапрыемстваў, як забарона пасьвіць скаціну па азіміне ўвосень, па сенажацях з вясны, догляд пасеваў, спуск вады з палёў, палоньне, асыпка і г. д., барацьба са шкоднікамі садоў, гародаў і палёў — павінны знайсьці адбітак у штодзеннай нашай рабоце па барацьбе за ўраджай.

Разгортваньнем вопытнай справы, калектыўнай творчай думкі шырокіх рабочых і калгасных мас па шляху рацыяналізацыі і вынаходзтве зломім апартунізм у правядзеньні агратэхнічных мерапрыемстваў, даб'емся новых перамог у барацьбе за высокі ўраджай праз рашучае ўкараненьне агратэхнікі.

А. Лашкевіч.

ПАРАДЫ АГРАНОМА

1735

АЦЯПЛІЦЬ НА ЗІМУ ХЛЯВЫ

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі рабочая кляса вырашае пытаньні жывёлагадоўлі шляхам арганізацыі жывёлагадоўчых калгасаў, саўгасаў, малочна-таварных фэрм.

Побач з разгортваньнем жывёлагадоўлі трэба, каб калгасьнікі і саўгасьнікі навучыліся правільна даглядаць жывёлу. У некаторых калгасах і саўгасах, у выніку дрэнна пастаўленага догляду,

Нова-пабудаваны цялятнік на 100 галоў у камуне „Пралетарская Воля" (Паўночны Каўказ).

асабліва маладняка, мы маем вялікі процант яго адыходу. Спрыяючымі ўмовамі для вялікага процанту адыходу зьяўляюцца дрэнныя ўмовы, у якіх знаходзіцца маладняк. Асабліва ў зімовы час шмат маладняка хварэе і прападае. Часта хлявы, у якіх знаходзіцца маладняка, надта халодныя. Ня ў лепшых умовах у радзе калгасаў і саўгасаў знаходзіцца і дарослая жывёла.

У выніку гэтага мы маем вельмі малую колькасьць малака і большую трату кармоў, асабліва сена. Карова ў халодным хляве прастуджваецца, скарачае дойны пэрыяд прыблізна на два месяцы, дае малака мала і зьядае значна больш сена. Карова, якая стаіць у халодным хляве, зьядае за зіму на 10 цэнтнэраў сена больш, чым тая карова, якая знаходзіцца ў цёплым хляве. Яшчэ многія калгасьнікі думаюць, што ацяпленьне хлявоў зьяўляецца ня важным мерапрыемствам. Некаторыя думаюць, што стары хлеў нельга зрабіць цёплым, што патрэбна будаваць новыя скотныя двары. Забясьпечыць у самы хуткі час тую жывёлу, якая ёсьць у кожным калгасе, новымі скотнымі будынкамі мы ня зможам, таму трэба скарыстаць усе старыя хлявы, з халодных зрабіць іх цёплымі. У нас гэтыя магчымасьці ёсьць у кожным калгасе і мы іх павінны скарыстаць.

У нас зараз увосень патрэбна ў кожным калгасе выдзеліць брыгады па ацяпленьні скотнага двара. На брыгаду ўскласьці наступную працу, вызначыўшы ёй тэрмін.

1. Забіць пакляй, альбо мохам усе шчыліны ў хляве.

2. Залатаць на страсе скотнага будынку дзіркі, каб праз іх не праходзіў дождж альбо сьнег.

3. Зрабіць у хляве столь. Пабудаваць яе наступным чынам: патрэбна ўзяць некалькі жэрдак і раскласьці іх з невялікімі прагалінамі, а зьверху палажыць пласт саломы.

4. Зрабіць вароты, якія-б шчыльна прыставалі і не прапускалі холаду.

5. Для асьвятленьня хлявоў трэба пабудаваць вокны. Плошча вокан павінна раўняцца $^1/_{16}$ частцы плошчы падлогі. Вокны трэба будаваць так, каб можна было іх адчыняць і праветрываць хлеў. Гэтыя пералічаныя мерапрыемствы зьяўляюцца самымі неабходнымі для ацяпленьня хлявоў.

Калгасьніца і саўгасьніца, дабівайся таго, каб гэтае пытаньне абгаварвалася на пасяджэньнях праўленьняў калгасаў, у саўгасах, на агульных сходах, змагайся з тымі, хто будзе зрываць гэтыя мерапрыемства, а разам з гэтым і зрываць выкананьне ўсіх плянаў па разьвіцьці жывёлагадоўлі намечаных партыяй і савецкай уладай.

Аграном Маркавец.

ЗДАВАЙЦЕ
ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ
РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ
ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП (б) Б.
Рэдактар Э. ШАПІРА.
Друкарня імя Сталіна
Заказ № 2258.
У ліку экз. 9.400 Галоўлітбел № 434.